УДК 1 (476)

# Заходнія даследчыкі палемічнай літаратуры ўсходнееўрапейскай прасторы XVI—XVIII стст.

**Д. А. Смалякоў**, аспірант*

*У артыкуле разглядаюцца работы і біяграфічныя дадзеныя аўтараў, якія даследавалі палемічную літаратуру Усходняй Еўропы XVI—XVIII стст. Таксама падаюцца разнастайныя еўрапейскія і паўночнаамерыканскія школы, якія спецыялізуюцца на ўсходнееўрапейскім кантэксце.*

# Western Researches of the Polemical Literature of the XVI—XVIII cent. East-Europe

**D. A. Smaliakou**, Postgraduate Student

*The article analyzes the West-European and US interest to the researches in field of tolerance in XVI—XVIII cent. Belarus. It proposes the wide number of researchers who published the notable works about polemical literature. It also proposes bibliographical data on those persons.*

З канца 1980-х гг. мінулага стагоддзя Заходні свет пачынае актыўна вывучаць Усходнюю Еўропу і ўсходнееўрапейскі кантэкст. Цікавымі робяцца гісторыя, палітыка, культура. Заходнія аўтары адкрываюць альтэрнатыўную форму еўрапейскасці, якая апынаецца ў некаторых момантах нават больш еўрапейскай за заходнія аналагі. Адным з такіх феноменаў з'яўляецца эпоха XVI—XVIII стст., час росквіту палемічнай літаратуры.

Да палемічнай літаратуры адносяць звароты, памфлеты, адозвы, лісты, дэкламацыі, разнастайныя праекты па паляпшэнні рэлігійнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай. Адправачнай кропкай папулярызацыі палемічнай літаратуры сталася Брэсцкая унія 1596 г., экуменічны акт, які раскалоў праваслаўную іерархію, прычым на некаторы час пакінуў па-за законам тую яе частку, якая адмовілася прызнаць старшынство папы рымскага. Далейшы раскол праваслаўнай іерархіі так ці іначай вымагаў абвінавачвання апанентаў і заахвочвання насельніцтва да навяртання да адной з супрацьдзеючых партый. Іншымі фактарамі з'яўляліся: разнастайнасць рэлігійных канфесій, складаная знешнепалітычная сітуацыя, шырокая юрыдычная база, якая рэгламентавала рэлігійную палеміку.

Аднак калі разглядаць палемічную літаратуру як вузкае поле змагання рэлігійнай іерархіі, то карціна наўрад ці будзе поўнай. Варта памятаць, што канец XVI — пачатак XVII ст. з'яўляецца эпохай Рэфармацыі, а значыць, шырокага пранікнення разнастайных пратэстанцкіх дэнамінацый у рэлігійнае поле Усходняй Еўропы. Рэфармацыя нясе не толькі змяненні ў галіне набажэнстваў, але і шматлікія навацыі, такія як распаўсюджанне друкаванага слова сярод насельніцтва. Улічваючы вышэйпералічанае, палемічная літаратура стала топасам камунікацый паміж разнастайнымі дэнамінацыямі, формай высвятлення падабенстваў і адрозненняў паміж канфесіямі, сведчаннем канфесіяналізацыі хрысціянскай рэлігіі.

Напрыканцы XVI ст. Беларусь як частка Рэчы Паспалітай была краінай з найбольш развітой заканадаўчай базай у галіне рэлігійнага права. Шматлікасць канфесій і поліэтнічнасць дзяржавы вымагалі вялікіх высілкаў па захаванні рэлігійнага міру. Дзякуючы прававым ініцыятывам, а таксама вялікім намаганням дзяржавы па захаванні міру паміж рэлігійнымі канфесіямі атрымалася пабудаваць адну з найталерантнейшых дзяржаў свету з надзвычайна развітой канфесіянальнай сістэмай. На глебе талерантных законаў і разнастайнасці канфесій паўстала феерыя аўтараў і твораў рэлігійнага характару, якія належалі да каталіцтва, пратэстантызму, уніяцтва, праваслаўя.

Як бачым, ва Усходняй Еўропе XVII ст. паспела скласціся ўнікальная сітуацыя поліфаніі рэлігійных галасоў, і кожны голас то заахвочваў далучыцца да сваёй канфесіі, то дэманізаваў апанентаў: Мікалай Радзівіл Чорны (1515—1565), Пётр Скарга (1536—1612), Іпацій Пацей (1541—1613), Стэфан Зізаній (1550—1634), Хрыстафор Філалет (1568—1624), Лявонцій Карповіч (1580—1620), Мялецій Сматрыцкі (1577—1633), Пётр Магіла (1596—1647), Алаізій Ян Кулеша (1660—1706), Ежы Казі-

* Аспірант 3 года навучання кафедры філасофіі культуры БДУ. Навуковы кіраўнік — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт А. А. Лягчылін.

мір Анцута (1650—1737) і шматлікія іншыя. Палемічная літаратура стала выразнікам набораў падабенстваў і адрозненняў паміж разнастайнымі канфесіямі, культурным сімвалам эпохі талеранцыі, хоць найчасцей гэты факт падаецца як сюжэт рэлігійных супярэчнасцей.

У часы рэлігійнай палемікі адбываўся працэс канфесіяналізацыі і канфесіі адасабляліся адна ад адной, выпрацоўвалі свае погляды на свет і на іншыя дэнамінацыі, таму нездарма дадзеную эпоху лічаць за вузлавы момант гісторыі Усходняй Еўропы, а значыць і Беларусі. З гэтага пункту гледжання робіцца зразумелай папулярнасць дадзенай тэмы сярод славістаў і даследчыкаў гісторыі Усходняй Еўропы ў заходніх універсітэтах, а таксама ў Беларусі. І калі з працамі А. А. Біралы, Э. К. Дарашкевіча, С. А. Падокшына, Я. І. Парэцкага, К. С. Пракошынай у Беларусі знаёмыя шырокія колы даследчыкаў, то традыцыя заходняй літаратуры застаецца па-за кантэкстам, у тым ліку дзякуючы адсутнасці перакладаў.

У хітраспляценні рэлігійнай палемікі не апошнюю ролю адыгрывалі шматлікія погляды на іўдаізм і месца іўдаізму ў канфесійным свеце, а таму наўрад ці магчыма грэбаваць гэтым істотным момантам. Варта дадаць, што тэма іўдаізму і іўдэйскіх уплываў на рэлігійны свет Усходняй Еўропы з'яўлялася адным з найбольш даследаваных аб'ектаў для заходняй навукі. Але гэта тэма стаіць асобным раздзелам гісторыі Усходняй Еўропы і вывучаецца ў асноўным гебраістамі, таму ў дадзеным разглядзе гаворка пойдзе пра даследчыкаў, якія займаліся палемічнай літаратурай хрысціянскіх дэнамінацый.

З пачатку XX ст. як у Беларусі, Літве і Украіне, так і ў новапаўсталай Польшчы тэма ВКЛ і рэлігійнага свету робіцца папулярнай праз вяртанне да вытокаў новых дзяржаў. Нягледзячы на тое што асноўныя аўтары палемічнай літаратуры лакалізаваліся на тэрыторыі сучасных Беларусі і Украіны, цяжка пераацаніць істотнасць рэлігійнай палемікі для Польшчы.

Складана ўявіць польскі вектар даследаванняў палемічнай літаратуры без класічных прац Вітольда Камянецкага (Witold Kamieniecki) (1883—1964), выкладчыка Варшаўскага ўніверсітэта, сябры Варшаўскага навуковага таварыства, прызнанага спецыяліста па юрыспрудэнцыі Вялікага княства Літоўскага і гісторыі талеранцыі. Навуковыя інтарэсы Вітольда Камянецкага ляжалі ў галіне даследавання гісторыі і філасофіі Усходняй Еўропы. На аснове аўтарскай філасофскай канцэпцыі гісторыі ён даследаваў палемічную літаратуру ў творах: «Генезіс літоўскай дзяржаўнасці» (1915) [1], «Літоўскае супольніцтва XV ст.» (1947) [2].

Асаблівую ўвагу заслугоўвае Казімір Хадыніцкі (Kazimierz Chodynicki) (1890—1942), даследчык талеранцыі, прафесар Віленскага і Познаньскага ўніверсітэтаў. Абараніў дысертацыю ў Ягелонскім універсітэце па тэме «Намаганні па навяртанні ў хрысціянства на Літве да 1386» (Próby zaprowadzenia chrześcijaństwa na Litwie przed rokiem 1386). У 1920 г. абараняе дысертацыю на званне дацэнта габілітаванага на тэму «Стаўленне Рэчы Паспалітай да праваслаўных усходняга ўзору» (Stosunek Rzeczypospolitej do wyznania grecko-wschodniego). Вось некаторыя яго працы, звязаныя з даследаваннем палемічнай літаратуры: «Рэфармацыя ў Польшчы» (1920) [3], «Праваслаўная царква і Рэспубліка Польшча. Гістарычны нарыс (1370—1632)» [4]. Іншыя яго работы — «Аб польскіх уплывах на дакументы Вялікага Княства Літоўскага» (O wpływach polskich na dokument ruski Wielkiego Księstwa Litewskiego) (1926), «Генезіс Брэсцкай уніі» (Geneza unii brzeskiej) (1935).

Нельга абысці ўвагай вялікага польскага гісторыка Юліуша Бардаха (Juliusz Bardach) (1914—2010). Прызнаны класік у гістарыяграфіі Вялікага княства Літоўскага, прафесар Варшаўскага ўніверсітэта, сябра Польскай акадэміі навук, ён прысвяціў сваё навуковае жыццё сярэднявечнай гісторыі і філасофіі гісторыі. Атрымаў доктарскую ступень у Ягелонскім універсітэце, стаў ганаровым доктарам Віленскага, Варшаўскага, Лодскага універсітэтаў. Па тэме міжрэлігійных стасункаў у Рэчы Паспалітай Юліуш Бардах выдаў шматлікія творы па-французску, у тым ліку «Узаемастасункі Каталіцкай і Праваслаўнай цэркваў на тэрыторыі Польшчы і Літвы XIV—XVI стст.» [5], а таксама папольску: «Мацей Стрыйкоўскі і яго творчасць» (1970) [6], «Царкоўныя брацтвы на русінскіх землях XVI—XVII стст.» (1967) [7].

Не лішне будзе звярнуць увагу на Марцэлі Козмана (Marceli Kosman) (нар. 1940), прафесара Познаньскага ўніверсітэта, даследчыка талеранцыі ў Вялікім княстве Літоўскім, адной з асноўных фігур, на якія спасылаюцца ў тым ліку і беларускія даследчыкі рэлігійнай гісторыі ВКЛ. Яго даследаванні талеранцыі ўвасобіліся ў буйную манаграфію «Пратэстантызм і контррэфармацыя. З набыткаў талеранцыі Рэчы Паспалітай XVI—XVIII ст.» [8]. Нельга абмінуць буйную працу па даследаванні гісторыі Беларусі «Гісторыя Беларусі» [9].

Пералічаныя аўтары сталі класікамі па даследаванні Усходняй Еўропы, а эмігранты з Украіны, Польшчы і Беларусі папулярызавалі іх працы за акіянам, у тым ліку спасылаліся на іх пры напісанні сваіх манаграфій. Але гэта тое, што тычыцца польскай візіі праблематыкі міжканфесійнай палемікі. Калі разглядаць пытанне з праваслаўнага ці нават

украінскага пункту гледжання, то немагчыма абмінуць постаць выбітнага украінскага гісторыка і філосафа Міхайла Сяргеевіча Грушэўскага (1866—1934), прафесара Львоўскага ўніверсітэта, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, а таксама акадэміка Акадэміі навук СССР.

Цяжка пераацаніць навуковую спадчыну Міхайла Грушэўскага: менавіта ён склаў шматтомнае выданне ўкраінскай літаратуры, дзе дэтальна апісаў рэлігійную палеміку з уніяцкага і праваслаўнага боку. Менавіта ў гэтым выданні прыведзены апісанні і пераказы асноўных крыніц па рэлігійнай палеміцы, а таксама пададзены ў скарачэнні арыгіналы. У гонар Міхайла Грушэўскага названа пасада прафесара па даследаванні Украіны ў Гарвардзе, адным з найлепшых амерыканскіх універсітэтаў, цэнтры па даследванні Усходняй Еўропы.

Менавіта гэтую пасаду займеў Сергій Плохій (нар. 1957), украінскі даследчык раннемадэрнай Украіны і Усходняй Еўропы. Прафесар Гарварда, Сергій Плохій выкладаў ва ўніверсітэце Альберці, з'яўляўся дырэктарам Канадскага інстытута ўкраінскіх штудый. Менавіта ён перакладаў Міхала Грушэўскага на англійскую мову, такім чынам робячы больш даступным даследаванне палемічнай літаратуры для заходняга чытача.

Стаўшы прафесарам Гарварда, Сергій Плохій выдаў некалькі манаграфій: выдадзеная ў Оксфардзе «Казакі і рэлігія ў раннемадэрнай Украіне» (2002) [10], а таксама вялікая праца па гісторыі Беларусі, Украіны і Расіі, выпушчаныя ў Кембрыджы, «Вытокі славянскіх нацый: дамадэрная ідэнтычнасць у Расіі, Украіне, Беларусі» (2006) [11].

Істотную ролю па даследаванні Берасцейскай уніі і шматлікай літаратурнай спадчыны рэлігійнай палемічнай літаратуры адыграў Барыс Гудзяк (нар. 1960). Нарадзіўся ў Злучаных Штатах Амерыкі, скончыў Сіракузскі ўніверсітэт, вучыўся ва ўніверсітэце Папы Урбана, Папскім арыентальным універсітэце, атрымаў ступень доктара славістыкі ў Гарвардзе. З'яўляецца адным з найбуйнейшых даследчыкаў на Захадзе па Брэсцкай уніі. Арганізатар шматлікіх канферэнцый, у тым ліку «Берасцейскіх чытаннях», якія тычыліся праблематыкі рэлігійнай уніі. Выдаў такія манаграфіі, як «Кіеўская мітраполія, Царградскі патрыярхат і генезіс Берасцейскай уніі», «Дзяржава, грамадства і царква ва Украіне XVII ст.», «Берасцейская унія і ўкраінская культура XVII ст.», «Менталітэт, ідэнтычнасць і багаслоўе ва Украіне і Беларусі XVII ст.», «Унійныя працэсы ў XVI—XVII стст. і іх эклезіястычная ацэнка». Яго грунтоўная праца «Крызіс і Рэформа: Кіеўская Мітраполія, Канстанцінопальскі Патрыярхат і генезіс Берасцейскай уніі» [15] стала надзвычай папулярным даследаваннем па рэлігійнай сістэме Беларусі і Украіны на англійскай мове і аб'яднала ў сабе набыткі старэйшых прац.

Істотна паспрыяў пранікненню тэмы міжканфесіянальных стасункаў ва Усходняй Еўропе XVI—XVII стст. і славістыкі як такой таксама выбітны чэшскі і амерыканскі навуковец Фрэнсіс Дворнік (Frencis Dvornik) (1893—1975), святар і даследчык, адзін з найбольш вядомых заходніх экспертаў па гісторыі славян і Візантыі, а таксама ўзаемастасунках паміж каталіцтвам і праваслаўем.

Фрэнсіс Дворнік вучыўся на факультэце Кірыла і Мефодыя ў Аламоўцы, перайшоў у Карлаў універсітэт у Празе, а праз год вучыўся ў Сарбоне, дзе і сфарміраваўся як візантыст. Абараніў дысертацыю на тэму «Славяне, Візантыя і Рым» [13]. Выкладаў у Карлавым універсітэце, а пасля Другой сусветнай вайны стаў прафесарам Гарварда, дзе выкладаў да канца жыцця. Чытаў лекцыі ў Кембрыджы, на іх аснове была складзена манаграфія «Славяне: іх даўняя гісторыя і цывілізацыя» (1956) [14]. Фрэнсіс Дворнік стаў адным з найвыбітнейшых класікаў заходняй славістыкі і даследавання па Візантыі, папулярызатарам даследаванняў гісторыі Усходняй Еўропы.

У гэтым рэчышчы не дзіва, што на Захадзе з'яўляюцца даследчыкі, якія не маюць непасрэднага дачынення да Усходняй Еўропы, але дзякуючы інтарэсу да праблематыкі становяцца вядучымі экспертамі ў галіне рэлігійных стасункаў у дадзеным рэгіёне, а таксама па гісторыі Беларусі, Украіны, Расіі. Да гэтага шэрагу навукоўцаў належыць Барбара Скінер (Barbara Skinner), дацэнт Дзяржаўнага ўніверсітэта Індыяны (ЗША).

Барбара Скінер атрымала ступень бакалаўра ў Ельскім універсітэце, працягнула адукацыю ў Джорджтаўнскім універсітэце, дзе атрымала ступень магістра. Актыўна вывучала рускую мову, што дало ёй магчымасць лёгка перакладаць з рускай мовы і нават працаваць перакладчыкам. На факультэце гісторыі вывучала гісторыю Усходняй Еўропы і Расіі. Яе даследчыцкі фокус быў сканцэнтраваны на рэлігійных стасунках у ранняй Расійскай імперыі і Польшчы. У тым жа ўніверсітэце Джорджтауна яна атрымлівае ступень доктара, піша вялікую манаграфію «Заходні фронт усходняй царквы» [15], дзе даследуе канфрантацыю паміж праваслаўем і каталіцтвам на тэрыторыі сучаснай Беларусі і Украіны ў XVIII ст.

Нягледзячы на тое што англамоўны даследчыцкі дыскурс з'яўляецца дамінантным у свеце, нельга забыцца на спадчыну Інстытута славянскіх даследаванняў, які месціцца ў Парыжы (Францыя). Адзін з найбуйнейшых даследчыкаў славян, а таксама рэлігійнай палемікі ў раннемадэрнай Польш-

чы Амбросі Жобе (Ambroise Jober), з'яўляючыся экспертам у галіне рэлігійных стасункаў, выдае манаграфію, якая стала адной з найбольш грунтоўных прац па рэлігійнай палеміцы XVI—XVIII стст. «Лютэр і Магіла, Польшча падчас крызісу паміж хрысціянскімі канфесіямі (1517—1648) (De Luther a Mohila, la Pologne dans la crise de Chretiente (1517—1648)) (1974) [16].

Як бачым, праблема міжканфесійнага дыялогу, талеранцыі, словам, усяго таго, выражэннем чаго была палемічная літаратура Рэчы Паспалітай XVII—XVIII стст., з'яўляецца даволі папулярнай тэмай у заходняй навуковай літаратуры. Пералічаныя аўтары ёсць толькі вяршыняй айсберга цікавасці да ўсходнееўрапейскага кантэксту, найбольш цытаванымі персонамі, выразнікамі цэлых школ і інстытутаў па даследаванні ўсходнееўрапейскай культурнай спадчыны, той базіс, на якім грунтуецца вялікая колькасць артыкулаў, лакальных даследаванняў і дакладаў на канферэнцыях. Між тым як шараговых даследчыкаў значна болей.

Заходні свет надзвычайна цікавіцца ўсходнееўрапейскай культурнай спадчынай, і не толькі з выключна акадэмічных прычын. Еўрапейцы і амерыканцы быццам наноў адкрываюць еўрапейскую культуру, напоўненую разнастайнымі народамі і рэлігіямі. Гэта мультыкультурная, поліканфесійная прастора, гістарычны ўзор сучаснага свету.

На пытанне, чаму палемічная літаратура Усходняй Еўропы XVI—XVIII стст. уяўляе цікавасць для заходняга чытача, якога аддзяляюць ад кантэксту тысячы кіламетраў і сотні гадоў, хочацца адказаць перакладам англамоўнага агляду да кнігі А. Жабэ, напісанай па-французску: «Пытанне талеранцыі становіцца ўсё больш істотным на Захадзе. Выдатная кніга Жазефа Леклера Histoire de la tolérance au siècle de la Réforme, выданая ў 1955 г., і перакладзеная на англійскую, нямецкую і польскую мовы, данесла да шырокай аўдыторыі разуменне, што ў XVI ст. Польшча была нашмат больш «прасунутая» ў пытаннях талеранцыі за заходнееўрапейскія нацыі» [17:116]. Іншымі словамі, гісторыя рэлігійнай палемікі, яе асаблівасці, глеба і перадумовы, яе набыткі і разрывы, якія яна фіксавала, ёсць відавочнай актуаліяй сучаснасці. Па сутнасці, сучасны свет ёсць гіпербалізаванай мадэллю Беларусі XVI—XVIII стст.: шматнацыянальнае насельніцтва, поліканфесійнае асяроддзе, некалькі буйных кропак культурнага і палітычнага ўплыву.

## Спіс цытаваных крыніц

1. *Kamieniecki, W.* Geneza państwa litewskiego Warszawa / W. Kamieniecki. — Warszawa, 1915.

2. *Kamieniecki, W.* Społeczeństwo litewskie w XV wieku / W. Kamieniecki. — Warszawa, 1947.

3. *Chodynicki, K.* Reformacja w Polsce / K. Chodynicki. — Warszawa, 1921.

4. *Chodynicki, K.* Kościół prawosławny a Rzeczpospolita Polska: zarys historyczny 1370—1632 / K. Chodynicki. — Warszawa, 1934.

5. *Bardach, J.* Le recontre des Eglises catholique at ortodoxe sur les territories occidentaux de Pologne et de Lithuanie aux XIV—XVI siecles / J. Bardach. — Florence, 1982.

6. *Bardach, J.* Maciej Stryjkowski i jego tworczość / J. Bardach. — Warszawa; Białystok, 1970.

7. *Bardach, J.* Bractwa cerkewne na ziemliach ruskich Rzeczypospolitej w XVI—XVII / J. Bardach. — Warszawa, 1967.

8. *Kosman, M.* Protestanci i kontreformacja. Z dziejów tolerancji w Rzeczypospolitej XVI–XVIII wieku / M. Kosman. —Warszawa, 1978.

9. *Kosman, M.* Historia Białorusi / M. Kosman. — Warszawa, 1979.

10. *Plokhy, S.* The Cossacks and Religion in Early Modern Ukraine / S. Plokhy. — Oxford, 2002.

11. *Plokhy, S.* The Origins of the Slavic Nations: Premodern Identities in Russia, Ukraine and Belarus / S. Plokhy. — Cambridge, 2006.

12. *Gudziak, B.* Crisis and Reform: The Kievan Metropolitanate, the Patriarchate of Constantinople, and the Genesis of the Union of Brest / B. Gudziak. — Cambridge, 1992.

13. *Dvornik, F.* Les Slaves, Byzance et Rome au IXe siècle / F. Dvornik. — Paris, 1926.

14. *Dvornik, F.* The Slavs: Their Early History and Civilization / F. Dvornik. — Boston, 1956.

15. *Skinner, B.* The Western Front of the Eastern Church: Uniate and Orthodox Conflict in Eighteenth-Century. Poland, Ukraine, Belarus, and Russia / B. Skinner. — DeKalib, 2009.

16. *Jober, A.* De Luther à Mohila. La Pologne dans la crise de la chrétienté (1517–1648) / A. Jober. — Paris, 1974.

17. *Harold, S. H.* Book reviews / S. H. Harold // The Polish Review. — 1976. — Vol. 21, no. 4. — P. 116—118.

*Дата поступления в редакцию: 10.04.2012 г.*